ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## ЗА ХАРЧОВУЮ БЯСПЕКУ КРАІНЫ

### На рабочай нарадзе парламентарыі абмеркавалі законапраект «Аб селекцыі і насеннятводстве сельскагаспадарчых раслін»

Сустрэча адбылася пад кіраўніцтвам **старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Аляксандра ПАПКОВА.** У нарадзе прынялі ўдзел намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Гракун, кіраўнікі навуковых, насенняводчых і сортавыпрабавальных арганізацый, работнікі Міністэрства фінансаў.

На думку Аляксандра Папкова, гэты законапраект дапаможа павысіць эфектыўнасць сельскагаспадарчай вытворчасці і гарантаваць харчовую бяспеку дзяржавы. Ён таксама дадаў, што заўвагі і прапановы Савета Рэспублікі па законапраекце «Аб насенняводстве сельскагаспадарчых раслін» у законапраекце, які разглядаецца, улічаны не цалкам. Зыходзячы з выказаных меркаванняў удзельнікаў сустрэчы было прынята рашэнне працягнуць распрацоўку дадзенага законапраекта з улікам унесеных прапаноў.

## НІХТО НЕ ЗАСТАНЕЦЦА БЕЗ ДАПАМОГІ

### Неабходна выявіць праблемныя моманты ў прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства

Аб гэтым заявіла **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Ала БОДАК** на пашыраным выязным пасяджэнні на тэму «Правапрымяняльная практыка Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь». У сустрэчы, якая адбылася ў Полацку, прынялі ўдзел парламентарыі, дэпутаты, прадстаўнікі органаў па грамадзянстве, міграцыі, працы, занятасці і сацыяльнай абароне Полацкага райвыканкама.

Паводле слоў парламентарыя, сёння праводзіцца пастаянны маніторынг практыкі прымянення вышэйназванага закона. Акрамя таго, актыўна вывучаецца эфектыўнасць рэгулявання гэтай галіны грамадскіх адносін і адпаведнасць нормаў закона сацыяльна-эканамічным рэаліям і патрэбам, а таксама магчымасцям грамадства і краіны ў цэлым.

На другі дзень выязнога пасяджэння Ала Бодак і намеснік старшыні гэтай Пастаяннай камісіі Віктар Чайчыц правялі асабісты прыём грамадзян, таксама адбылася прамая тэлефонная лінія. Усе грамадзяне атрымалі неабходныя кансультацыі па розных пытаннях — пачынаючы ад правядзення тэндараў і заканчваючы дзейнасцю садаводчых таварыстваў.

## БЕСПЕРАПЫННАЯ РАБОТА Ў РЭГІЁНАХ

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Мар'яна ШЧОТКІНА** наведала Мядзельскі раён Мінскай вобласці.

У рамках свайго візіту Мар'яна Шчоткіна прыняла ўдзел у пасяджэнні Мядзельскага раённага выканаўчага камітэта. Цэнтральнай тэмай нарады стаў ход рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады ў Мядзельскім раёне.

Пасля заканчэння пасяджэння Мар'яна Шчоткіна правяла асабісты прыём грамадзян — да парламентарыя звярнулася 3 чалавекі. Грамадзяне атрымалі неабходныя тлумачэнні і рэкамендацыі па ўсіх зададзеных пытаннях. Акрамя таго, асобныя аспекты былі ўзяты на асабісты кантроль намесніка старшыні Савета Рэспублікі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

# НА РОЎНЫХ

— Хацелася б звярнуць увагу на тое, што адна з падпраграм дзяржаўнай праграмы распрацавана, каб вырашыць праблемы працаўладкавання людзей з інваліднасцю, — дадаў Аляксандр Румак. — Ідзе праца над безбар'ерным асяроддзем. За 2007—2016 гады работы па стварэнні безбар'ернага асяроддзя выкананы на 21,8 тыс. аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры рэспубліканскай і камунальнай формаў уласнасці, закуплена больш за 3,3 тыс. адзінак нізкападлогавага пасажырскага транспарту. Акрамя забеспячэння доступу для людзей з парушэннямі апорна-рухальнага апарату ствараецца свабодны доступ да інфармацыі і пазітыўнае меркаванне грамадства ў адносінах да інвалідаў. Так што сёння галоўны кірунак далейшай дзейнасці — развіццё сацыяльных паслуг, якія дазволяць суправаджаць людзей з інваліднасцю ў іх дамашнім асяроддзі.

На круглым стале не абышлося і без абмеркавання спрэчных момантаў. Удзельнікі разгледзелі праблему нядобрасумленнага будаўніцтва, якое парушае нормы безбар'ернага асяроддзя, звярнулі ўвагу на магчымасць падрыхтоўкі спецыялістаў — перакладчыкаў мовы жэстаў. Адзначылі неабходнасць распрацоўкі індывідуальнай праграмы рэабілітацыі для дзяцей. Закранулі пытанне забеспячэння і зручнасці тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, большасць якіх вырабляе Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр.

### Што адпавядае міжнароднаму стандарту?

Яшчэ адной важнай тэмай абмеркавання стала далучэнне Беларусі ў 2015 годзе да Канвенцыі аб правах інвалідаў. Ірына Старавойтава адзначыла, што гэтае дзеянне запатрабавала сур'ёзных абавязацельстваў і карэкціроўкі заканадаўчай нарматыўна-прававой базы краіны, значных фінансавых укладанняў.

— Разам з грамадскімі арганізацыямі мы распрацавалі нацыянальны план па рэалізацыі Канвенцыі, — расказаў Аляксандр Румак. — Мэта Канвенцыі заключаецца ў заахвочванні, ахове і забеспячэнні поўнага ажыццяўлення інвалідамі на роўнай аснове ўсіх правоў чалавека. Яна ахоплівае такія параметры, як даступнасць, індывідуальная мабільнасць, здароўе, адукацыя, занятасць, рэабілітацыя, удзел у жыцці грамадства, а таксама роўнасць і адсутнасць дыскрымінацыі. Беларусь далучалася да Канвенцыі з пэўным багажом уласных напрацовак.

Змяненняў, каб адпавядаць міжнародным стандартам, запланавана многа, так, напрыклад, будзе ўведзены і растлумачаны новы тэрмін «дыскрымінацыя па прыкмеце інваліднасці», з'явяцца прапрацаваныя нормы, па якіх можна будзе ўводзіць чалавека ў паўнавартасную сацыяльную, працоўную і іншую дзейнасць. Мяркуецца ўвесці механізм сітуацыйнай дапамогі — гэта калі чалавек трапляе на які-небудзь аб'ект і побач знаходзіцца супрацоўнік, гатовы дапамагчы, падказаць, як той можа скарыстацца пэўнымі паслугамі, напрыклад, наведаць культурнае мерапрыемства, ажыццявіць паездку ў транспарце.

### Дом без стэрэатыпаў

Удзельнікі круглага стала таксама азнаёміліся з умовамі пражывання ў доме-інтэрнаце. Мінскі дом-інтэрнат для пенсіянераў і інвалідаў дае жыллё, занятак і магчымасць стасункаў для падапечных рознага ўзросту, інвалідаў I і II груп і разлічаны на адначасовае пражыванне 405 чалавек. Сёння тут 390 жыхароў. Дырэктар установы Вера Ляўкоўская паказала, якім чынам арганізавана жыццё падапечных, правяла гасцей па жылых пакоях і спецыяльных кабінетах.

Акрамя медыцынскай дапамогі і рэабілітацыі ў доме-інтэрнаце дзейнічае кабінет працатэрапіі, дзе падапечныя ствараюць дэкаратыўныя кампазіцыі, паштоўкі, сувеніры. Асноўная задача — аднаўленне страчаных магчымасцяў. «Нават маленькая падзвіжка, калі чалавек самастойна можа паднесці лыжку да рота — гэта ўжо перамога», — кажа дырэктар. У кабінеце эрготэрапіі спецыялісты дапамагаюць развіваць дробную маторыку, займаюцца з кожным індывідуальна, па спецыяльных праграмах рэабілітацыі.

Не выходзячы з установы можна трапіць у кінатэатр, актавую залу, дзе ладзяцца ў тым ліку канцэрты і дыскатэкі, бібліятэку, кабінет для фізічных заняткаў. Зусім нядаўна будынікі, якія праводзілі капітальны рамонт, падарылі дому-інтэрнату спеліякамеру — саляныя пакой для лячэбных працэдур.

Падапечныя інтэрната маюць магчымасць і прафесійнай дзейнасці, 45 чалавек атрымалі працоўныя рэкамендацыі.

Здараліся і гісторыі, калі падапечны трапляў у дом-інтэрнат на калясцы, а потым ішоў жыць на кватэру ўласнымі нагамі. Работнікі інтэрната падтрымліваюць з такімі «выпускнікамі» сувязь, распытваюць, ці не патрэбна дапамога. Удзельнікі круглага стала адзначылі важнасць індывідуальнай работы з кожным чалавекам.

Членамі Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі падведзены папярэднія вынікі аб неабходнасці комплекснага падыходу пры рашэнні праблем і ўдасканаленні заканадаўства па пытаннях інвалідаў. Сёння патрабуюць карэкціроўкі не толькі закон аб сацыяльнай абароне інвалідаў, але і закон аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці, закон аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў. Мэты нацыянальнага заканадаўства супадаюць з мэтамі Канвенцыі аб правах інвалідаў.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й «МС».)*

З ПЫТАННЕМ ДА ДЭПУТАТА

# ВАШЫ ПРАБЛЕМЫ — НАША РАБОТА

### Кіраўнікі сельскіх выканкамаў расказваюць пра свае надзённыя клопаты

**Хто, калі не мясцовая ўлада, павінна штодзённа працаваць над праблемамі грамадзян? Мы пацікавіліся, чым цяпер займаюцца старшыні сельскіх Саветаў дэпутатаў і якія праблемы ім прыходзіцца вырашаць.**

Старшыню **Рудскага Савета дэпутатаў Іванаўскага раёна Пятра КУРЫШКУ** мы засталі за падрыхтоўкай даклада па выніках першага паўгоддзя. Дарэчы, усяго за гэты перыяд было сем зваротаў грамадзян у вуснай і пісьмовай формах. Апошняя — па бадзяжных сабаках. Такое пытанне час ад часу ўзнікае: камусьці перашкаджае гаўканне, іншым — самі сабакі. Прыйшлося выклікаць адлоў, каб справіцца з гэтай праблемай.

Надзённыя пытанні вырашаюцца і ў Кіраўскім сельсавеце Жлобінскага раёна. **Канстанцін СЦЕПАНЦОЎ, в. а. старшыні Кіраўскага сельвыканкама,** расказвае, што займаюцца добраўпарадкаваннем, імкнуцца дапамагаць неўладкаваным сем'ям, наведваюць былых вязняў канцэнтрацыйных лагераў. У гэтых пытаннях галоўным памочнікам старшыні заўсёды з'яўляецца староста, які ведае сваю вёску і яе жыхароў. Напрыклад, не так даўно ў вёсцы Лугавая Вірня адной з бабуль, якая звярнулася, дапамаглі па гаспадарцы: абкасілі траву вакол хаты, дапамаглі з добраўпарадкаваннем.

З гэтага тыдня ў Мяжанскі сельсавет прыязджае машына з прадукцыяй ад СВК «Маяк Браслаўскі». Жыхары, як гаворыць **старшыня Мяжанскага Савета дэпутатаў Браслаўскага раёна Жанна АКУЛА**, гэтага чакалі даўно. З-за чумы свіней знайсці якаснае мяса на вёсцы не так проста: многія перасталі трымаць гэтую жывёлу, таму прыйшлося дамаўляцца з СВК, каб было зручней. Да таго ж апошнім часам у сельсавеце заняліся непасрэдна добраўпарадкаваннем як тэрыторыі, так і сельскіх аб'ектаў. Так, была абноўлена трусаферма: там прыбралі лішнія кусты і дрэвы і завезлі новыя клеткі.

**Аляксей ГРЫНЮК, старшыня Малабераставіцкага Савета дэпутатаў Бераставіцкага раёна** расказвае, што цяпер у сельвыканкаме займаюцца базай даных грамадзян, якія пражываюць адны і ў якіх няма аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў (АПА). Усяго такіх на тэрыторыі сельсавета 98. Высвятляюць, з якіх прадпрыемстваў яны выходзілі на пенсію, — а гэта былыя супрацоўнікі розных сфер. Мяркуецца, што потым усталяваць у кожнай хаце АПП дапамогуць іх былыя работадаўцы. Са зваротаў грамадзян, апошняя праблема, якую прыйшлося вырашаць, — гэта падтопленыя падвалы. Гэтым заняліся ў ЖКГ.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*


**О выплате дивидендов по акциям. Открытое акционерное общество «Стройдетали». Месторасположение: Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134**

Общим собранием акционеров общества от 01.08.2017 г.

принято решение о выплате дивидендов акционерам за 1-е полугодие 2017 г.

Размер начисленных дивидендов на 1 простую акцию составляет 1,98 руб.

Дата выплаты дивидендов с 02.08.2017 г. по 07.11.2017 г. – путем перечисления на карт-счета, почтовым переводом и кассу предприятия.

УНП 600246748



**ОБЪЯВЛЕНИЕ О ПОВТОРНЫХ ТОРГАХ**

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | Лот №1. Изолированное помещение с инв. №220/D-13854, назначение – торговое помещение, наименование – магазин, общей площадью 118,3 кв. м, стоимостью 67 032 белорусских рубля |
| **Собственник (владелец) имущества** | ОАО «Глубокская птицефабрика» (УНП 300019583) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Глубокое, ул. Ленина, 46-2 |
| **Наличие обременений** | нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | 23.08.2017 в 11.00<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого,10/1, каб. 1.4 |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома<br>210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1.<br>http://www.vitebskjust.gov.by/info/anounces/<br>Судебный исполнитель – Ильющенков Алексей Александрович,<br>тел./факс. 8 (0212) 614018, 8 (033) 6879145 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома №BY73AKBB36429030010372000000 в 200-м филиале ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Витебска, БИК AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 22.08.2017.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии со ст. 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем). |